Калі, ня дай Бог, Злучаныя Штаты пачнуць вайну з Іракам, тады Расея можа паспрабаваць захапіць Беларусь і пайсьці на авантуру. Напрыклад, падрыхтаваць пераварот, адхіліць Лукашэнку ад улады і паставіць свайго прадажнага „дэмакрата” з „апазыцыі” (з тых, што некалі павыганяў Лукашэнка). Гэтыя — прададуць Беларусь за капейку.

Беларуская альтэрнатыва мусіць будзе тады змагацца супраць усёй навалы ў вельмі цяжкіх варунках.

**7.** Улічваючы пастаянную і мэтанакіраваную імпэрскую агрэсію Расеі супроць Беларусі, пастаянныя спробы ўмяшаньня ва ўнутраныя справы нашай краіны, беларусам (перш за ўсё Беларускаму Нацыянальна-Вызвольнаму Руху) трэба будзе часова адмовіцца ад ліквідацыі прэзыдэнцкай сістэмы на Беларусі, але збалянсаваць функцыі ўладаў. Існаваньне парляманцкай рэспублікі ў такіх напоўваенных умовах (як менш мабільнай улады) аблегчыла б расейцам разбурэньне Беларусі.

Першымі павінны адбыцца ***новыя выбары прэзыдэнта Беларусі пад міжнародным пратэктаратам***, а ўжо потым — парляманцкія, на зьмешанай прапарцыйна-мажарытарнай аснове.

## ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

Зноў нам пагражае Масква. Мы павінны рыхтавацца да бітвы за Беларусь і за нашу Волю.

Мы, беларусы, цяперашнія і будучыя пакаленьні, павінны зноў усьвядоміць тое, што ведалі нашы продкі 150 і 200 гадоў таму: *свабоду заваюем толькі тады, калі маскаля над намі ня будзе!*

У рэальнасьці гэта азначае (і гэта пацьвердзіла наша гісторыя), што ***пакуль існуе расейская імпэрыя, датуль будзе пагроза нашай свабодзе, і волю сваю мы можам мець толькі часова.***

Выснова, якая пасьлядоўна вынікае з нашай гісторыі і сучаснасьці, — адна: ***расейская імпэрыя павінна быць разбурана. Агрэсіі Масквы не павінна існаваць.***

Вось задача, якая стаіць перад беларусамі і ўсімі народамі. Наша гістарычная памылка, што мы толькі абараняліся. Мы хварэлі на комплекс Альгерда, на комплекс літасьці да сьмяртэльнага ворага, пакідаючы паверженых жыць у той час, як яны, застаўшыся ў жывых, рабілі наадварот.

Памятайма: ліквідацыя імпэрскай, шавіністычнай Расеі, якой кіруе цяпер былы НКВД, будзе ў інтарэсах самога рускага народа і ў інтарэсах усіх народаў, што апынуліся пад гэбоўскай расейскай дыктатурай. Гэта будзе ў інтарэсах усяго сьвету, які збавіўся б ад агрэсіўнай Расеі — галоўнага падпальшчыка вайны на плянэце.

Гэта зразумелі гераічныя чачэнцы, якія змагаюцца за сваю свабоду і свабоду ўсіх, і ўсе да аднаго вераць у перамогу. „Яе ўжо не існуе, — кажуць яны пра „скопішча зла”, — толькі няма каму аб'явіць”.

Мы, беларусы, павінны набліжаць той час, калі аб'явім пра канец расейскай імпэрыі і пра вечную нашу свабоду.

Мы мусім разумець, што *нашае змаганьне за волю і незалежнасьць Беларусі — гэта ёсьць змаганьне з Расеяй.*

Цяпер яна адкрыта і нахабна адчыніла на нас свой рот, на ўвесь сьвет заяўляючы, што хоча зьнішчыць нашу краіну.

Рыхтуймася ж да барацьбы, да змаганьня і да перамогі над ужо ня вечным ворагам беларускай нацыі.

*8 верасьня 2002 года* ***Зянон ПАЗЬНЯК***

## ШТО ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ ЛУКАШЭНКА

Па ўсім відаць, што дні гэбоўскага прэзыдэнта Пуціна ў Расеі ўжо палічаныя. Відаць таксама, што Расея не адступіцца ад пляну захопу Беларусі, а Лукашэнка — ад імкненьня ўдзельнічаць у расейскай палітыцы.

У гэтай вострай для Беларусі сітуацыі беларусы павінны выразна, бязьлітасна і катэгарычна даць зразумець Лукашэнку, што ў выпадку, калі ён, скарыстаўшы рэжым бясправўя і дыктатуры, здасьць Беларускую краіну і беларускую незалежнасьць Расеі, то месца яму на ўсёй зямлі і на ўсім гэтым сьвеце ня будзе нідзе.

У здрадніка не павінна ўзьнікаць нават ілюзіяў, што пасьля гэтага ён зможа недзе схавацца.




# ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Бюлетэнь БКА

**№1**
*Верасень 2002 г.*


## СТВАРЭНЬНЕ БКА

У канцы жніўня, пасьля арганізацыі Менскага гарадзкога Камітэта па Абароне Бацькаўшчыны і пасьля стварэньня першых мясцовых Камітэтаў па Абароне, прадстаўнікі КА і прадстаўнікі беларусаў замежжа прынялі рашэньне аб утварэньні Агульнага Беларускага Камітэту па Абароне Бацькаўшчыны ад расейскай агрэсіі (скарочана — Беларускі Камітэт Абароны, БКА). Беларускі Камітэт Абароны і ягонае кіраўніцтва часткова знаходзяцца за мяжой. У пачатку верасьня пачалася дзейнасьць. БКА кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

* * *

Камітэты па Абароне ствараюцца паўсюдна: па месцы працы, жыхарства, вучобы, дзяржаўнай і вайсковай службы. Колькасьць сяброў — ад трох да сямі асобаў. Калі зьяўляецца больш асобаў, ствараецца іншы Камітэт. Камітэты дзейнічаюць аўтаномна. Сьпісы ўдзельнікаў не складаюцца, удзел не фіксуецца. Каардынацыя вызначаецца вуснымі інструкцыямі і на падставе лістоў БКА.

Дзейнасьць Камітэтаў па Абароне разьвіваецца паэтапна, спэцыяльныя задачы вызначаюцца вусна. Пагрозы асобам з боку КА не дапускаюцца.

Задачы першага этапу заключаюцца ў наступным:

— адсочваньне дзеяньняў і кантроль за антыканстытуцыйнай дзейнасьцю чыноўнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, навучальных установаў, камандзіраў вайсковых фармаваньняў, сродкаў масавай інфармацыі;

— папярэджваньне аб крымінальнай адказнасьці асобаў, якія праводзяць яўную або ўскосную антыканстытуцыйную дзейнасьць, накіраваную на ліквідацыю незалежнасьці і сувэрэнітэту Беларусі, на асіміляцыю маладога беларускага пакаленьня, на зьнявагу нацыянальнага гонару і годнасьці беларусаў, на дыскрымінацыю беларускіх нацыянальных каштоўнасьцяў;

— інфармаваньне грамадзянаў пра сутнасьць і небясьпеку для беларусаў хлусьлівай прапаганды пра „шчасьлівую будучыню” у так званай „саюзнай дзяржаве” пад крамлёўскім кіраўніцтвам;

— інфармаваньне беларускага грамадзтва пра неабходнасьць ігнараваньня любых выбараў і рэфэрэндумаў, арганізаваных рэжымам;

— інфармаваньне грамадзянаў, якіх рэжым уцягвае ў свае нібыта „выбарчыя” арганізацыі і „выбарчыя” мерапрыемствы, пра адказнасьць перад дзяржавай Рэспублікай Беларусь і беларускім народам за супрацоўніцтва з акупацыйным рэжымам на карысьць іншаземнай дзяржавы (Расеі);

— інфармаваньне беларускага грамадзтва пра неабходнасьць правядзеньня новых выбараў прэзыдэнта Беларусі пад міжнародным пратэктаратам (без удзелу Расеі як агрэсіўнай краіны);

— інфармаваньне грамадзянаў пра неабходнасьць стварэньня па месцы жыхарства і на прадпрыемствах ***Камітэтаў самакіраваньня***, грамадзкіх органаў ***аховы парадку*** і ***самаабароны***. Спрыяньне і дапамога ў іхнай арганізацыі.

* * *

Мясцовыя Камітэты Абароны мусяць адразу наладзіць выпуск і распаўсюджваньне інфармацыйных бюлетэняў МКА і электронную перадачу інфармацыі.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Кіраўнік БКА***

*Ліст да ўсіх беларусаў*
*19 жніўня 2002 г.*
*(Скарочана)*

## АБ КАНКРЭТНЫХ ДЗЕЯНЬНЯХ. ПЕРШЫ ЧЫН.

Небясьпека над беларускай незалежнасьцю навісла з 1994 года. Цяпер, пасьля грубых заяваў Масквы пра пляны анэксіі Беларусі, гэтая небясьпека набывае агрэсіўныя формы.

***Галоўнай першачарговай задачай для беларускага грамадзтва ёсьць абарона суверэнітэту і незалежнасьці Беларусі, змаганьне супраць расейскай агрэсіі.***

Беларусы ва ўсім сьвеце мусяць выступіць адзіным фронтам у абароне незалежнасьці нашай дзяржавы. Змагаемся ўсюды, дзе мы ёсьць: ад глухога беларускага мястэчка да Менску, ад Менску да Нью-Ёрка, Отавы, Парыжу, Лёндана і Сіднэя. Жыве нашае беларускае Алраджэньне, жыве Рада БНР, жыве Беларусь!

Асновай змаганьня супраць расейскай агрэсіі і прарасейскага акупацыйнага рэжыму ёсьць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Палажэньні артукула 1-га Канстытуцыі абавязваюць нас стаць на абарону нашай краіны перад пагрозай расейскай акупацыі.

***„Артыкул 1. Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.***

***Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыцьцяўляе ўнутраную і зьнешнюю палітыку.***

***Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасьць і тэрытарыяльную цэласнасьць, канстутыцыйны лад, забясьпечвае законнасьць і парадак.” (арт.1)***

***„Не дапускаецца заключэньне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі”***, — гаворыцца ў артыкуле 8.

***„Тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная”***, — вызначае артыкул 9.

***„Абарона Рэспублікі Беларусь — абавязак і сьвяты доўг грамадзяніна Рэспублікі Беларусь”***, — сказана ў артыкуле 57.

Рэспубліка Беларусь зьяўляецца сябрам Арганізацыі Аб’еднаных Нацыяў і мае права на міжнародную падтрымку супраць агрэсара.

Цяпер, калі Масква адкрыта аб’явіла пра плян і тэрмін захопу Беларусі, у той час, калі рэжым узурпатара Лукашэнкі здрадзіў беларускаму народу і Беларускай дзяржаве, стаў выканаўцам расейскіх захопніцкіх плянаў, справу абароны дзяржавы ад зьнешняй агрэсіі, у адпаведнасьці з Канстытуцыяй, павінен узяць у свае рукі беларускі народ на Бацькаўшчыне і ва ўсім сьвеце (куды вымушана закінуў беларусаў лёс і прывяло змаганьне з рускім імпэрыялізмам).

Першыя крокі мусяць быць зробленыя тут, у нас, у Рэспубліцы Беларусь.

З мэтай абароны ад расейскай агрэсіі паўсюдна (у гарадах, раёнах, вёсках, на прадпрыемствах, ва ўстановах) ствараюцца ***грамадзкія Камітэты па абароне ад расейскай агрэсіі (Камітэты па абароне)...***

Беларусам неабходна згуртавацца. Мы павінны пазнаваць адзін аднаго паўсюдна, дзе б мы ні былі. Трэба гаварыць па-беларуску, насіць і карыстацца нашай сымволікай.

Усім беларусам трэба памятаць пра падступнасьць расейскай агрэсіі і маскоўскага пляну захопу нашай тэрыторыі. Яны прагаварыліся (Селязьнёў, Вішнякоў і іншыя), што стварэньне „саюзу” Беларусі з Расеяй было б першым этапам на шляху да анэксіі. Тады (пасьля загнаньня ў „саюз”) захапіць Беларусь ім было б ужо лягчэй.

Мы павінны быць цьвёрдымі ў абароне сваёй жыцьцёвай прасторы, сваёй культуры, спадчыны, дзяржавы і незалежнасьці.

Мы мусім заўсёды даваць рашучы адпор нахабству, хамству, варварству акупантаў, чужой агентуры, якая быццам бы „разважае”, што, маўляў, яны ня супраць незалежнасьці, але за „саюз” з Расеяй. Нельга дазваляць антыбеларускую агітацыю.

Трэба брацца за працу і рыхтавацца да змаганьня.

## ЗАЎВАГІ ПА АСПЭКТАХ

**1.** Правільная ацэнка і аналіз становішча. Трэба заўсёды мець на ўвазе стратэгічную задачу маскоўскай агрэсіі на Беларусі, ***якая заключаецца ў зьнішчэньні нашай незалежнасьці***, нашых культурна-нацыянальных і эканамічных асноваў, у інкарпарацыі нашай нацыянальнай тэрыторыі ў склад Расеі. З гэтага гледзішча трэба ацэньваць усе падзеі і ўсю расейскую прапаганду.

**2.** Нельга дапускаць уцягваньня ў „кіруемы канфлікт” „Лукашэнка-Пуцін” беларускага насельніцтва. ***Лукашэнка ня ёсьць абаронцам незалежнасьці Беларусі. Гэта вораг беларускай незалежнасьці. Расея робіць праз яго сваю захопніцкую палітыку.*** Прэч абодвух, разам з Расеяй!

Мы супрацьпастаўляем ім нашу беларускую незалежніцкую альтэрнатыву. Ніякіх „саюзаў”, ніякіх „дамоваў”, ніякіх сумесных справаў, ніякіх дачыненьняў з нашым адвечным ворагам — імпэрскай Расеяй.

***Незалежная Беларусь мусіць быць у добрых дачыненьнях з эўрапейскімі суседзямі і супрацоўнічаць з усім сьветам, акрамя Расеі.***

**3.** Нельга ўдзельнічаць у маскоўска-лукашэнкаўскіх палітычных сцэнарах. Прэч маскоўскую акупацыйную палітыку на Беларусі! Беларусы не павінны прымаць удзел ні ў якіх выбарах і рэфэрэндумах, арганізаваных лукашэнкаўскім рэжымам па падказках Масквы.

***Грамадзяне Беларусі адлучаныя ад фармаваньня ўлады ў сваёй краіне***. Рэжым стварыў адмысловую сістэму фальсіфікацыі выбараў. Любы ўдзел беларусаў у любых выбарах і рэфэрэндумах дае магчымасьць рэжыму дасягнуць патрэбных яму вынікаў. Нельга даваць такіх магчымасьцяў прамаскоўскай дыктатуры.

**4.** Нельга блытаць вікаўскую падстаўную „апазыцыю” (гэта значыць, усе так званыя „дэмакратычныя” партыі, былую пакрыўджаную намэнклятуру, камуністаў і былых лукашэнкаўскіх халуёў) зь Беларускім Нацыянальна-Вызвольным Рухам (Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”, Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ), які ёсьць *рэальнай апазыцыяй* супраць захопніцкай палітыкі Масквы і прамаскоўскага рэжыму ў Беларусі.

Вікаўская так званая „дэмакратычная апазыцыя” — гэта частка „кіруемага канфлікту”, арганізаванага маскоўска-нямецкімі палітыкамі. Яе выкарыстоўваюць па маскоўскім сцэнары супраць нацыянальных інтарэсаў Беларусі.

**5.** Нельга падтрымліваць прапагандовы тэзіс Масквы і савецкай адміністрацыі на Беларусі аб тым, што для беларускага суверэнітэту патрэбныя сьціслыя эканамічныя дачыненьні з Расеяй.

***Для беларускай незалежнасьці непатрэбна ніякіх дачыненьняў з Расеяй, акрамя дачыненьняў на аснове міжнароднага права праз добрую мяжу.***

Расея праводзіць мэтанакіраваную агрэсіўную палітыку адносна Беларусі. У такой сітуацыі ня можа быць нармальных эканамічных стасункаў з Расеяй. Бо ***Расея скарыстоўвае эканамічныя дачыненьні як сродак агрэсіі і захопу Беларусі.***

Прыклад. Эстонія ўжо ў 1991 годзе зьнізіла гандлёвы абарот з Расеяй да 10-ці адсоткаў і пераарыентавалася на гандаль са скандынаўскімі краінамі. У выніку — Эстонія поўнасьцю вызвалілася ад уплыву расейскай палітыкі. Расейскія дэфолты і крымінальныя стрэсы ў эканоміцы ніяк не ўплываюць на эстонскую крону і эстонскую гаспадарку.

Тым часам Латвія і Летува маюць гандлёвы абарот з Расеяй вышэйшы за 20 адсоткаў і зьяўляюцца сфэрамі частковага ўплыву расейскай імпэрскай палітыкі. Прытым гэты ўплыў і ціск штораз павялічваецца (захоп рускімі нафтаперагоннага заводу ў Мажэйкяй у Летуве, правакацыі ў Рызе і г.д.).

Гандлёвы абарот Беларусі з Расеяй мусіць быць у гэтай сітуацыі ня большы за 5-7 адсоткаў. Гэта ёсьць эканамічная і палітычная праўда. І гэта нам трэба.

Залежнасьць цяперашняй Беларусі ад расейскай эканомікі створана штучна і ў значнай ступені прапагандова. Сітуацыя хутка выпраўляецца, калі на гэта будзе воля беларускай улады.

Трэба не забывацца таксама, што ўдзельная вага ўсёй эканомікі Расеі меншая за ўдзельную вагу эканомікі такіх краінаў, як Бэльгія ці Швайцарыя. Тым часам Швайцарыя, напрыклад, — гэта па насельніцтву ўсяго 5 мільёнаў чалавек, а па тэрыторыі — плошча нашай Гарадзенскай вобласьці.

Гэта што датычыць рэальных пэрспэктываў Беларусі і рэальнай цаны рускай прапаганды, накіраванай на зьневажэньне нашай краіны.

**6.** Беларусы павінны арыентавацца ў міжнароднай палітыцы. *Нашым сябрам ёсьць Амэрыка, і мы павінны падтрымліваць яе ва ўсім.*

Расея хоча скарыстаць складанасьць міжнародных абставінаў, каб беспакарана забіваць на Каўказе і каб анэксаваць Беларусь.